Download

Белсат ✔
Белсат
Але ёсць і добрыя навіны! У Докшыцкім раённым судзе сёння разглядалі справу журналіста Змітра Лупача, датычную сюжэту пра лёс докшыцкага помніку Леніну. Суддзя Дзяніс Корсак вывучыў матэрыялы справы, апытаў сведку і прыйшоў да высновы, што... няма падставаў…
Суд паўторна разгледзіць спыненую справу журналіста Змітра Лупача.

Па скарзе начальніка Докшыцкага РАУС Сяргея Каралевіча і апратэставання пастановы Докшыцкага раённага суда в. а. пракурора **Надзеі Міцько** адміністратыўную справу журналіста-фрылансера Змітра Лупача будзе разглядаць Віцебскі абласны суд. Разгляд мае адбыцца 9 чэрвеня аб 11-й гадзіне.

18 траўня суддзя Докшыцкага суда **Дзяніс Корсак** спыніў адміністратыўную справу ў дачыненні Змітра Лупача праз недаказанасць віны. Журналіста вінавацілі ў парушэнні Закона аб СМІ і хацелі прыцягнуць да адказнасці паводле артыкулу 23.5 КаАП (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ). Пратакол на яго склаў маёр міліцыі Докшыцкага РАУС **Андрэй Юргель**. Падставаю для адміністратыўнай справы стаўся фельетон на YouTube-канале «Белсату» пад назваю *«Леніна знайшлі загорнутым у цэлафан»*.

Крыніца: @bajby
t.me/belsat/51549
23.4K viewsedited Jun 7, 2021 at 12:14